з'явы, якія ёсць у бегу (вялікія нагрузкі на суставы і ўнутраныя органы, з'яўленне артрозаў суставаў).

Мы спадзяёмся, што рэкамендаваныя вышэй простыя практыкаванні дапамогуць студэнтам-завочнікам у іх прафесійнай дзейнасці і што набыты імі практычны вопыт яны перададуць сваім вучням.

*Лысяпкоў Ф.М., дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ НАВЫКАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ МАЛОДШЫХ КУРСАЎ У КЛАСЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЯ НА ФЗН

Характар і накіраванасць заняткаў па дырыжыраванні абумоўлены спецыфікай самога дырыжорскага мастацтва. Шматпланавасць дырыжорскай спецыяльнасці патрабуе выкарыстання разнастайных форм самастойнай работы. Змест самастойнай работы вызначаецца і наяўнасцю розных поглядаў на методыку навучання дырыжыраванню.

У працэсе самастойнай работы над партытурай дырыжору неабходна не толькі вывучаць, аналізаваць нотны тэкст, але таксама і абдумваць формы, метады рэпетыцыйнай работы. Ён павінен абдумваць штрыхі, пры неабходнасці іх змяненне, намячаць спосабы рэпеціравання асобных месцаў партытуры твора. Студэнт на пачатковым этапе павінен асвойваць партытуру і ў мануальным плане, шукаць жэставыя формы адлюстравання музычных вобразаў, прыёмы кіравання тэхнічна складанымі месцамі твора.

Накіраванасць хатніх заняткаў студэнта залежыць ад мэты, якую ён ставіць, і таго, што лічыць неабходным ён асвойваць і развіваць, якімі метадамі пры гэтым карыстацца. Самастойная работа звязваецца з работай у класе, яе вынік адлюстроўвае ўстаноўку педагога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разнастайнасць форм і метадаў правядзення хатніх заняткаў паказчык адносін да дырыжорскага выканання, неаднолькавага ўспрымання яго сутнасці. Некаторыя захапляюцца выкананнем, дырыжыруюць горача, тэмпераментна, іншыя ж выключаюць з дырыжыравання любыя эмоцыі.

Асабліва значныя адрозненні бачым у адносінах дырыжораў да тэхнікі дырыжыравання. Форма малюнкаў такціравання, спосабы выканання іх, тое ці іншае становішча рукі часам выглядаюць надуманымі. Напачатку навучання студэнт павінен імкнуцца да максімальнай выразнасці жэста і не абмяжоўваць сябе ўмоўнасцямі, якія скоўваюць фантазію, замінаюць перадаваць выканальніцкія намеры.

Умовы, калі дырыжор працуе самастойна, не дазваляюць развіваць выканальніцкія навыкі так натуральна, як гэта ўдавалася б інструменталісту. Дзеля таго каб павысіць эфектыўнасць самастойнай работы, трэба перш за ўсё вызначыць яе змест. Толькі маючы ўяўленне пра тое, што ж давядзецца асвойваць студэнту, можна і разглядаць пытанне аб метадычных прынцыпах.

У самастойнай рабоце вылучаюць два бакі. Яны выяўляюць адрозненні ў формах і метадах заняткаў. Адзін з іх, вельмі важны на першым этапе навучання, ставіць за мэту ўсебаковае развіццё навыкаў дырыжыравання. Другі бок самастойнай работы - гэта асваенне партытуры. Практычна два бакі непарыўна звязаны, яны неабходныя на ўсіх этапах творчага росту дырыжора.

Вялікае значэнне для развіцця здольнасцей і навыкаў мае партытура твора, які вывучаецца. Напачатку заняткаў па дырыжыраванні трэба выбіраць творы яркія, наглядныя па вобразнасці і эмацыянальным характары. Такія творы дапамагаюць дырыжору-пачаткоўцу самастойна знаходзіць мануальныя сродкі ўвасаблення.

Работа над партытурай можа весціся ў трох накірунках:

- асваенне партытуры за раялем;
- асваенне пры дапамозе ўнутранага слыху;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– мануальнае асваенне.

Першыя два накірункі характарызуюцца агульнасцю сваіх установак, метадаў, цесна звязаны адзін з адным. Мануальнае асваенне твора можна назваць "практычнай" формай работы, якая ўяўляе вялікую складанасць для самастойнай работы дырыжора, бо працякае без зносін з выканаўцамі. На малодшых курсах студэнта не цікавіць пытанне: "Чаму менавіта гэтыя жэсты здаюцца лепшымі?" Ён не спрабуе ўнікнуць у іх сутнасць, тым больш адчуць змест. Разгледзім асобныя метады дамашніх заняткаў: метад выканальніцкага і мануальнага раздзельнага асваення партытуры па галасах і фактурных слаях; метад супастаўлення; метад супастаўлення ў спалучэнні з метадам раздзельнага дырыжыравання; метад раздзельнага асваення выразных элементаў выканання; метад раздзельнага дырыжыравання.

Метад раздзельнага асваення партытуры дыктуе спецыфіка дырыжорскага выканання. Дырыжыруючы ў час хатняй работы рознымі галасамі і фактурнымі слаямі па чарзе, дырыжор больш глыбока вывучае іх выразныя ўласцівасці. Метад раздзельнага асваення партытуры дазваляе навучэнцу ахапіць слыхам увесь комплекс галасоў. Практыка паказвае, што ў час хатніх заняткаў студэнт дырыжыруе толькі тым, што можа спець пра сябе. Калі ён прапявае найбольш важны голас, то астатнія элементы аркестравай фактуры перастаюць ім успрымацца.

Метад раздзельнага асваення партытуры прымушае студэнта чуць усе галасы партытуры, знаходзіць дырыжорскія сродкі для адначасовага кіраўніцтва імі.

Метад супастаўлення развівае аналітычныя здольнасці студэнта, вучыць параўноўваць розныя жэсты, асаблівасці выканання. Для таго каб параўнаць нязначныя адрозненні, трэба навучыцца распазнаваць прыкметныя: інтанацыйныя, дынаміку, рытміку, агогіку і г.д. Калі студэнт напачатку бачыць толькі значныя адхіленні, то па меры развіцця навыку яго слых становіцца больш тонкім. Важна ўмець параўноўваць раней вызначаныя ўласцівасці жэста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метад супастаўлення і метад раздзельнага асваення партытуры развіваюць увагу дырыжора, прымушаюць заўважаць, усведамляць асаблівасці нотнага тэксту. Метад раздзельнага вывучэння партытуры па фактурных слаях прымушае дырыжора не толькі чуць усе галасы партытуры, бачыць падваенні, падгалоскі, вытрыманыя гукі, але і разбірацца ў структуры твора, адчуваць яго вобразны змест, характар. Метад супастаўлення дапамагае дырыжору пераадольваць супярэчнасць паміж тэхнічным і выразным бакамі дырыжыравання. Прадырыжыраваўшы фразу, навучэнец павінен правяраць, ці не дапускае ён якіх-небудзь рытмічных недакладнасцей, “змазаных” ауфтактаў і г.д.

Такціраваннем даволі проста авалодаць дырыжору. Больш складанымі з’яўляюцца мануальныя сродкі, што перадаюць структуру музычнай формы, дынаміку развіцця і эмацыянальна-вобразны змест твора. Адлюстраваць гэта ў жэстах не заўсёды ўдаецца маладому дырыжору, вялікую дапамогу тут аказвае метад раздзельнага асваення элементаў выканання. Вырашэнне задачы выразнага дырыжыравання праходзіць шэраг этапаў. Спачатку дырыжыруюць як мага рытмічней, не звяртаюць увагі на выразныя асаблівасці музыкі, каб праверыць рытмічную дакладнасць жэста, ліквідаваць памылкі ў такціраванні.

Пасля праверкі такціравання дырыжор звяртае ўвагу на тое, ці выразна перададзены жэстамі лагічныя, сэнсавыя сувязі, адносіны паміж долямі і тактамі. Потым ён ставіць новую мэту – выяўленне матыўнай структуры ў развіцці фразы як адзінай пабудовы. Наступным этапам з’яўляецца пошук сродкаў перадачы вобразнасці музычнага руху, вобразнага зместу. Пошукі прыёмаў супастаўлення трэніруюць увагу і назіральнасць, развіваюць аналітычнае мысленне, дырыжорскую фантазію, адчуванне гуку “ў руцэ”.

Найбольш універсальны метад – метад раздзельнага дырыжыравання. Ён развівае патрэбныя дырыжору навыкі, здольнасці:

— увагу, назіральнасць;

— здольнасць да аналітычнага мыслення;

— уменне чуць галасы партытуры;

— здольнасць кантраляваць ход выканання.

Гэты метад дапамагае зразумець функцыю кожнага голасу партытуры, функцыянальныя сувязі паміж галасамі, ролю рытмічнага суправаджэння. Пры мануальным асваенні партытуры метад раздзельнага дырыжыравання дазваляе знаходзіць сродкі "поліфанічнага кіравання" і выяўляць галасы, якія даюць апору для кіравання, пераносіць кіраванне з аднаго голасу на іншыя, ужываць "абагульняльныя жэсты", ужывальныя для ўсіх галасоў.

Метад раздзельнага дырыжыравання можа быць выкарыстаны як сродак самакантролю з мэтай праверкі дакладнасці жэста, знаходжання дэфектаў тэхнікі дырыжыравання, выпраўлення памылак выканання.

Затрачваючы ў пачатку навучання многа часу на набыццё важнага навыку – умення працаваць над творам (партытурай), дырыжор у далейшым будзе мець меншую патрэбу ў дэталёвым штудзіраванні матэрыялу, зможа абмежавацца супастаўленнем тых элементаў, якія ўяўляюцца яму найбольш важнымі для вырашэння канкрэтнай задачы.

***Ляйко Н.А.**, дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА "КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ" У ГРУПАХ СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ СЯРЭДНЮЮ СПЕЦЫЯЛЬНУЮ АДУКАЦЫЮ

У апошнія гады шмат увагі надаецца вырашэнню праблем суадносін вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі не толькі выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, але і практыкамі. У сувязі з сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі зменамі ў нашай рэспубліцы ўсё часцей перад кіраўнікамі бібліятэкі паўстаюць праблемы аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ